ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын"
М.О.Давыдзік

# ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні раённага творчага конкурсу на лепшы аўтарскі верш, прысвечаны гораду Масты і сваёй малой радзіме, "Роднаму краю часцінку сябе прысвячаю ..."

## 1. Агульныя палажэнні

1.1 Творчы конкурс на лепшы аўтарскі верш "Роднаму краю часцінку сябе прысвячаю ..." (далей – Конкурс) праводзіцца ў рамках рэалізацыі сумеснага праекта дзяржаўнай установы культуры "Мастоўская раённая бібліятэка" і ўстановы "Рэдакцыя газеты "Зара над Нёманам" "Родны край – крыніца натхнення".

1.2 Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца Мастоўская раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын", дзяржаўная установа культуры "Мастоўская раённая бібліятэка" і ўстанова "Рэдакцыя газеты "Зара над Нёманам".

1.3 Прыняць удзел у конкурсе можа любы жыхар Мастоўскага раёна і горада Масты незалежна ад узросту.

## 2. Мэты і задачы Конкурсу

2.1 Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення, папулярызацыі здольнасцей таленавітых паэтаў Мастоўшчыны, якія пішуць пра родны край і стварэнне ўмоў для іх актыўнай творчай дзейнасці.

2.2 Асноўнымі задачамі Конкурсу з'яўляюцца:
- павышэнне цікавасці мастаўчан да гісторыі сучаснасці і будучыні сваёй малой радзімы, роднага горада;
- стварэнне асяроддзя творчых зносін, сітуацыі поспеху;
- спрыянне развіццю творчага патэнцыялу і папулярызацыі паэтычных здольнасцяў аўтараў – жыхароў г.Масты і Мастоўскага раёна;
- выяўленне і далучэнне да дзейнасці ГА "Беларускі саюз жанчын" найбольш таленавітых і здольных прадстаўнікоў Мастоўшчыны;
- прадастаўленне магчымасці для пераможцаў прадэманстраваць свае паэтычныя здольнасці перад насельніцтвам раёна.

## 3. Умовы, тэрмін і парадак правядзення

3.1 Тэмай вершаў прадстаўленых на Конкурс павінны паслужыць:
- горад Масты,
- любоў да малой радзімы.

3.2 Конкурс праводзіцца з 1 ліпеня 2023 года па 20 жніўня 2023 года.

3.3 Вершы, высланыя пазней пазначанага тэрміну, разглядацца журы не будуць.

3.4 Заяўкі на ўдзел і творчыя працы прымаюцца ў адрас рэдакцыі раённай газеты "Зара над Нёманам" па адрасу: г.Масты, вул. Савецкая, 34 альбо па электроннай пошце zarja@mail.grodno.by.

3.5 На Конкурс прымаюцца толькі вершы.

3.6 Кожны ўдзельнік можа прадставіць на Конкурс не больш за тры вершы.

3.7 Вершы прымаюцца ў суправаджэнні заяўкі згодна Дадатка 2.

## 4. Патрабаванне да работ

4.1 На Конкурс прымаюцца:

- вершы любога аб'ёму незалежна ад даты іх напісання, на беларускай ці на рускай мовах;
- вершы, якія змяшчаюць ненарматыўную лексіку, а таксама вершы, якія маюць у змесце прыкметы распальвання нацыянальнай, расавай альбо рэлігійнай варожасці да конкурсу не дапускаюцца;
- вершы павінны мець назву, могуць быць маляўніча і творча афармлены і суправаджацца каментарамі аўтара.

4.2 Накіроўваючы свае вершы на Конкурс, кожны ўдзельнік павінен прадаставіць поўную інфармацыю пра сябе:

- прозвішча, імя, імя па бацьку;
- дата нараджэння;
- месца работы, вучобы;
- хатні адрас, тэлефон.

## 5. Крытэрыі ацэнкі работ

Асноўнымі крытэрыямі вызначэння пераможца з'яўляюцца:

- актуальнасць і адпаведнасць тэме Конкурса;
- навізна і арыгіяльнасць падачы матэрыялу;
- якасць афармлення матэрыялаў.
-

## 6. Падвядзенне вынікаў, ўзнагароджанне

6.1. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы (Дадатак 1) у перыяд з 21 па 24 жніўня 2023 года.

6.2. Пераможцы будуць вызначаны ў двух узроставых групах:

- дзеці і моладзь (да 31 года);
- дарослыя (ад 31 года).

6.3. Узнагароджванне пераможцаў Конкурсу адбудзецца на свяце горада Масты 26 жніўня 2023 года. Пераможцам будзе дана магчымасць прачытаць свой верш са сцэны у час свята горада.

6.4. Вершы ўдзельнікаў і спіс пераможцаў Конкурсу будуць надрукаваны на сайце ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка".

6.5. Работы пераможцаў Конкурсу будуць надрукаваны на сайце і старонках раённай газеты “Зара над Нёманам”.

6.6. Удзельнікі, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца дыпломамі і спецыяльнымі падарункамі ад Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын".

Дадатак 1

Склад журы раённага творчага конкурсу на лепшы аўтарскі верш, прысвечаны гораду Масты і сваёй малой радзіме, "Роднаму краю часцінку сябе прысвячаю ..."

1. Давыдзік Марына Осіпаўна – намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама, старшыня Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын";
2. Палуйчык Анастасія Валер’еўна – загадчык сектарам культуры Мастоўскага райвыканкама;
3. Бачко Ірына Пятроўна – галоўны рэдактар установы “Рэдакцыя газеты “Зара над Нёманам”;
4. Шэўчык Наталля Аляксееўна – намеснік галоўнага рэдактара установы “Рэдакцыя газеты “Зара над Нёманам”, член праўлення Мастоўскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын";
5. Стэльмах Таццяна Іосіфаўна – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”;
6. Ярашук Таццяна Збігнеўна – загадчык сектарам па абслугоўванню дзіцячага чытача дзяржаўнай установы культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”;
7. Сакута Наталля Алегаўна – намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г.Масты”, настаўнік рускай літаратуры і мовы.

Дадатак 2

# ЗАЯЎКА

на ўдзел у раённым творчым конкурсе на лепшы аўтарскі верш прысвечаны гораду Масты і сваёй малой радзіме "Роднаму краю часцінку сябе прысвячаю ..."

8. Прозвішча________________________________
9. Імя________________________________
10. Імя па бацьку________________________________
11. Дата нараджэння, узрост________________________________
12. Месца вучобы альбо працы________________________________
13. Адукацыя ________________________________
14. Хатні адрас________________________________
15. Тэлефон________________________________
16. Назва верша(ў)________________________________
17. Верш

Я ________________________________

даю згоду на апрацоўку персанальных даных, якія змяшчаюцца ў заяўцы, для ўдзелу ў Конкурсе і размяшчэння інфармацыі аб Конкурсе, у тым ліку фатаграфій, зробленых у ходзе падвядзення вынікаў Конкурсу, на афіцыйным сайце установы "Рэдакцыя газеты "Зара над Нёманам" і дзяржаўнай установы культуры "Мастоўская раённая бібліятэка".

| ________________ | ________________ | ________________ |
|---|---|---|
| Дата | подпіс | ініцыялы. прозвішча |